СЁННЯ, 18 САКАВІКА, — АПОШНІ ДЗЕНЬ ПАДПІСКІ НА ГАЗЕТУ СВАБОДА

СВАБОДА

Год заснавання 1902
Выходзіць з 1990
Галоўны рэдактар Ігар Гермянчук
Заснавальнік і выдавец Павел Жук
Наклад 41.480
Адрас рэдакцыі:
220088, Мінск, вул.Іванаўская, 56
Тэл./факс 2 362 441

Аўторак, 18 сакавіка 1997 | № 29 | Кошт свабодны

Браць усіх!

У мінулую пятніцу на падыходзе да плошчы Свабоды міліцыя схапіла трох карэспандэнтаў нашай газеты, якія былі накіраваныя рэдакцыяй асвятляць маладзёжную маніфестацыю.

Спачатку мы планавалі, што пра гэта напіша карэспандэнт СВАБОДЫ Альгерд Невяроўскі. З гэтай мэтаю ён і адправіўся з рэдакцыі на плошчу Свабоды, але ўжо праз паўгадзіны мы атрымалі па сотавай сувязі паведамленне, што Невяроўскі затрыманы міліцыяй. Каб адсочваць далейшыя падзеі на плошчы, з рэдакцыі тэрмінова выехалі яшчэ два нашыя супрацоўнікі — Алесь Дашчынскі і Гальяш Патаповіч. Але і яны ў рэдакцыю не вярнуліся. Іх схапіла міліцыя яшчэ на падыходзе да плошчы (каля рэстарана «Патсдам») — журналістаў запіхнулі ў машыну, не звяртаючы ўвагі на рэдакцыйныя пасведчанні. Дашчынскага і Патаповіча ўтрымлівалі ў Маскоўскім РАУС чатыры гадзіны. Альгерда Невяроўскага трымалі больш трох гадзінаў. Такім чынам, нашым журналістам не ўдалося прасачыць за падзеямі на плошчы, таму рэпартаж для СВАБОДЫ (які друкуецца ніжэй) зрабіў па нашай просьбе карэспандэнт польскай *Gazety Wyborczej* Цэзары Галінскі.

У пятніцу мінская моладзь планавала паўтарыць акцыю пад лозунгам «Беларусь у Еўропу-2». Нагадаем, што месяц таму, 14 лютага, калі ў дзень святога Валянціна моладзь прызналася ў каханні да Еўропы прадстаўнікам заходніх амбасадаў, удзельнікаў маніфестацыі пасля яе завяршэння заатакавала міліцыя. Гэтым разам акцыю задушылі яшчэ да пачатку.

Напярэдадні шэф мінскай міліцыі генерал-маёр Барыс Тарлецкі на прэс-канферэнцыі пабяцаў: *«Мы выкарыстаем усе магчымыя сродкі супраць тых, хто захоча парушыць парадак у горадзе»*. І генерал стрымаў сваё слова. Дзесяткі аўтобусаў і грузавікоў з міліцыяй, АМОНам і спецназам акружылі наваколле плошчы Свабоды яшчэ за некалькі гадзінаў да пачатку запланаванай акцыі. Менавіта на плошчы Свабоды (насупраць амбасады Францыі) на 17:00 быў запланаваны збор моладзі. Каб спыніць паток дэманстрантаў, частка якіх прыязджала на метро, часова была зачыненая станцыя метро Няміга.

Нягледзячы на гэта, на плошчы сабралася каля тысячы маладых людзей, а супрацоўнікаў сілавых структур (у форме і цывільным) — у некалькі разоў больш.

Масавыя затрыманні пачаліся яшчэ да пачатку мерапрыемства. Спачатку хапалі толькі больш актыўных удзельнікаў, а потым пачаўся сапраўдны «хапун». Непасрэдна на плошчы стаялі УАЗікі, у якія міліцыянты запіхвалі ўсіх, каму не ўдавалася вырвацца з кальца. Сярод затрыманых аказаліся нават журналісты і выпадковыя прахожыя (у тым ліку два грамадзяніны ФРГ і два амерыканцы, іх адпусцілі з міліцыі толькі пасля рашучай рэакцыі амбасадаў гэтых краінаў).

Карэспандэнта СВАБОДЫ Альгерда Невяроўскага завалаклі ў «варанок» у 16:45. «За што?» — паспелі мы запытацца ў сяржанта, які зачыняў дзверы спецмашыны. *«Ругался нецензурными словами»*, — прагучала ў адказ.

Журналістку газеты «Имя» Ірыну Халіп узялі на гадзіну пазней (таксама не звяртаючы ўвагі на яе рэдакцыйнае пасведчанне). *«Если невиновата — то скоро отпустят»*, — адмахваўся іншы «начальнік», калі два магутныя хлопцы ў касках і бронекамізэльках зацягнулі журналістку ў машыну.

Сярод затрыманых былі яшчэ больш за дзесяць журналістаў , у тым ліку фотакарэспандэнт Сяргей Грыц, Раман Якаўлеўскі («Белорусская газета»), Сяргей Маліноўскі («Свободные новости — плюс»), Аляксандр Міхальчук («Белорусская газета»), Алесь Хмяльніцкі (радыё «Свабода»), Павел Карназыцкі («Здравый смысл») і супрацоўніца Беларускага Хельсінкскага камітэта Святлана Курс. За краты трапілі таксама дэпутат Анатоль Лябедзька і Барыс Гюнтэр з БНФ.

За няпоўную гадзіну колькасць дэманстрантаў, якія знаходзіліся на пляцы, зменшылася з 1.000 да 300 чалавек. Міліцыя хапала нават дзяцей па 12—13 год. Астатніх разганялі дубінкамі, выцясняючы далей ад плошчы Свабоды. Атрад міліцыі заатакаваў нават людзей, што чакалі аўтобуса на прыпынку перад каталіцкім Катэдральным саборам. Пасажыры недастаткова хутка адрэагавалі на загад міліцыянтаў *«разыходзіцца, бо транспарту не будзе»*. Паводле першых падлікаў кіраўніцтва БНФ, каля 150 асобам быў запрапанаваны у пятніцу зусім іншы транспарт.

Цэзары ГАЛІНСКІ

Апазіцыя выйшла на праспект

Апазіцыя правяла ў Мінску шэсце і мітынг, прысвечаныя трэцім угодкам Канстытуцыі 1994 года.

Не зважаючы на забарону Мінскага гарвыканкама і прэзідэнцкі дэкрэт № 5, святочная калона прайшла ад плошчы Якуба Коласа да Палаца спорту, дзе адбыўся дазволены ўладамі мітынг. Міліцыя не перашкаджала дэманстрантам, аднак фіксавала кожны іх крок на відэакамеры.

Аб'яднаная апазіцыя рыхтавалася да Дня Канстытуцыі, каб «штурмаваць цытадэлі рэжыму». Многія лідэры, бадай, стаміліся сядзець у сваіх цесных штаб-кватэрах, заваленых рознымі ўлёткамі, і рваліся на шырокі прастор мінскіх праспектаў і плошчаў. 15 сакавіка гэта адбылося. У 11 гадзін раніцы каля 5 тысячаў чалавек сабраліся на плошчы Якуба Коласа. Праз паўгадзіны, калі калона выйшла на праспект Скарыны, дэманстрантаў было ўжо на пару тысячаў больш. На шляху да Палаца спорту лічба ўдзельнікаў шэсця яшчэ павялічылася, а ўсяго ў мітынгу на праспекце Машэрава ўдзельнічала больш за 15 тысяч чалавек. (Дзяржаўныя СМІ гэтую лічбу, як звычайна, занізілі амаль удвая). Для параўнання: леташні мітынг, прысвечаны Дню Канстытуцыі, сабраў пад свае сцягі каля 5 тысячаў чалавек. Такім чынам, «Вясна-97» стартуе з вышэйшай прыступкі.

Шэсце ў падтрымку Канстытуцыі-94 маршрутам нагадвала мінулагодні «Чарнобыльскі шлях»: ад плошчы Якуба Коласа праз плошчу Перамогі да цырка, адтуль па вуліцы Янкі Купалы да Нямігі і на праспект Машэрава. Аднак на гэты раз дэманстранты нават не спрабавалі прарываць міліцэйскія кардоны. Каля цырка Генадзь Карпенка праз мегафон павіншаваў «абаронцаў прэзідэнта» са святам: *«Прыйдзе час, і вы будзеце бараніць Канстытуцыю»*, — сказаў віцэ-спікер сцяне са шчытоў і дубінак, якая трымала халоднае маўчанне.

Ідучы вуліцамі сталіцы, дэманстранты зрывалі са слупоў лукашэнкаўскія сцягі, чаго раней на падобных акцыях не назіралася. Відаць, узровень напружанасці ў грамадстве і недавер да ўладаў моцна павысіўся. Зрэшты, дзяржаўныя структуры пачалі біць уласныя рэкорды жорсткасці і бессаромнасці ў дачыненні да апазіцыйна настроеных грамадзянаў, што прадэманстраваў дзень 14 сакавіка. Бадай, толькі статус Дня Канстытуцыі як дзяржаўнага свята стрымаў улады ў гэты дзень ад жорсткіх сілавых дзеянняў. Увогуле, да такога варыянту рэжым быў гатовы — пра гэта сведчылі і моцна ўзброеныя кардоны на працягу ўсяго шэсця, і сілы, сканцэнтраваныя на вулках Верхняга горада і вакол прэзідэнцкай рэзідэнцыі на вуліцы Карла Маркса.

Дарэчы, дробнымі «вылазкамі» міліцыя сябе ўсё ж пацешыла: калі ўжо ішоў мітынг, каля дзесяці юнакоў былі затрыманыя непадалёк ад станцыі метро Няміга. Іх завезлі ў пастарунак на аўтамабілях «Жыгулі» 1555 МІ і УАЗ 0288 МН. Адзін з затрыманых, 16-гадовы Сяргей Пецюкевіч, быў дастаўлены ў Цэнтральны РАУС і вечарам адпушчаны. Але ў нядзелю, 16 сакавіка, яго зноў арыштавалі і пасадзілі на трое сутак. Як паведаміў бацькам юнака маёр міліцыі Г.Курачук, іхні сын абвінавачваецца *«ў зрыванні дзяржаўнага сцяга»*, чаму быццам бы ёсць сведкі (пэўна, калегі таварыша маёра). А затрымалі хлопца ў самым пачатку праспекта Машэрава: Сяргей адышоўся да кіёска, каб купіць «Фанту», — і стаў ахвярай чарговага хапуна.

Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ

(працяг тэмы на стар. 3)

На здымках: святочнае шэсце на праспекце Скарыны; на скрыжаванні з вуліцай Янкі Купалы (каля цырка) супраць дэманстрантаў былі выстаўленыя дзевяць шчыльных кардонаў.

Хадыку судзілі па-савецку

Напружаная атмасфера, што трымалася вакол штаб-кватэры Беларускага народнага фронта апошнія тыдні, разрадзілася 13 сакавіка ўвечары вобыскам у офісе БНФ і гвалтоўным захопам Юрыя Хадыкі.

Дэтэктыўны сюжэт распачаўся ў той момант, калі ў зачыненыя дзверы штаб-кватэры пастукалі людзі ў скураных куртках, якія заявілі, што шукаюць па адрасе Варвашэні, 8 асабліва небяспечнага злачынцу. Сябры БНФ, ведаючы пра вобыск на штаб-кватэры Грамадзянскай партыі і чакаючы аналагічных падзеяў у сябе, заявілі, што дом нумар 8 вялікі, і параілі (праз зачыненыя дзверы) пашукаць злачынцу ў іншым месцы.

У гэты час да сядзібы пачалі падыходзіць жанчыны, якія крочылі на семінар па вывучэнню Бібліі, што ладзіў прафесар Юрый Хадыка, а таксама сябры маладзёжнай фракцыі БНФ, у якіх у гэты ж час павінна было распачацца паседжанне. Дзверы штаб-кватэры заставаліся зачыненымі, а на ганку, акрамя людзей у цывільным, з'явіліся міліцыянты ў форме на чале з Сяргеем Гірэлем. Утварыўся натоўп людзей, якія па розных прычынах імкнуліся пранікнуць у штаб-кватэру.

(Працяг на стар. 2)

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Хадыку судзілі па-савецку

(Пачатак на стар.1)

У гэты момант да штаб-кватэры падышоў намеснік старшыні БНФ Юры Хадыка. Сп.Хадыка настойліва і неаднаразова запатрабаваў ад людзей у скураных куртках прадставіцца, тыя адмовіліся. Тады Хадыка загадаў прапускаць у штаб-кватэру толькі людзей у міліцэйскай форме. Міліцыянтаў прапусцілі, і дзверы сядзібы зноў зачыніліся. Адразу пасля гэтага (прыкладна ў 18:30) рукі Хадыкі былі заламаныя людзьмі ў цывільным, а супраць жанчынаў, якія кінуліся бараніць прафесара, быў ужыты слезацечны газ. Хадыку запхнулі ў міліцэйскі «варанок», а ў штаб-кватэры распачаўсяператрус.

Лёс арыштаванага Хадыкі праясніўся толькі раніцай наступнага дня. Намесніка старшыні БНФ спачатку даставілі ў Савецкі райаддзел міліцыі, а ўначы перавезлі ў Маскоўскі РАУС Мінска. Увесь гэты час жонцы Хадыкі пра лёс мужа паведамляць адмаўляліся.

У пятніцу, 14 сакавіка, суд над Хадыкам двойчы адкладваўся, і толькі а 16-й гадзіне ў судзе Савецкага раёна Мінска выконваючы абавязкі суддзі Ігар Крывалапаў распачаў слуханне справы, якое больш нагадвала няўмела разыграны фарс і цягнулася пяць гадзінаў.

Аказваецца, як вынікала з пратаколу затрымання, Юры Хадыка *«перашкаджаў дзеянням работнікаў міліцыі пры выкананні імі сваіх службовых абавязкаў, не падпарадкоўваўся законным патрабаванням міліцыі і брудна абляваў не супрацоўнікаў»*. На судзе Юры Хадыка заявіў, што не толькі не перашкаджаў людзям у форме выконваць свае абавязкі, а нават дапамагаў ім, загадаўшы прапусціць міліцыянтаў у штаб-кватэру. Людзі ў цывільным, што адмаўляліся прадставіцца, выклікалі ў сп.Хадыкі рэзоннае падазрэнне (ён прыняў іх за налётчыкаў «Прямого действия», якія дэкларуюць неабходнасць падаўляць апазіцыю сілай). Але нават і ім перашкаджаць «выконваць абавязкі» сп.Хадыка не мог, таму што ў руках трымаў цяжкі «дыпламат».

Як высветлілася толькі на судзе, людзьмі ў цывільным аказаліся супрацоўнікі крымінальнага вышуку. Тыя самыя людзі, якія здзейснілі гвалтоўны захоп прафесара, цяпер выступалі ў якасці сведкаў. Начальнік крымінальнай міліцыі Маскоўскага РАУС Мікалай Жыбурдзёнак, які, уласна, і кіраваў аперацыяй захопу «асабліва небяспечнага злачынцы», заявіў на судзе, што прадстаўляцца кожнаму ён не збіраўся і не збіраецца, а тым больш таму, хто лаяўся матам (значыць, прафесару Хадыку). Са словаў Жыбурдзёнка вынікала, што крымінал Хадыкі, акрамя лаянкі, заключаўся ў тым, што прафесар, патрабуючы дакументы, таргануў за рукаў курткі супрацоўніка крымінальнага вышуку Алега Суліма. Сам Суліма пацвердзіў словы начальніка, але пры апісанні дэталяў пачаў блытацца. Тое ж самае адбылося і з астатнімі трыма сведкамі: супрацоўнік крымінальнага вышуку Уладзімір Гаржыцкі, напрыклад, быў упэўнены, што «дыпламата» ў руках Хадыкі не было, а таму ён «перашкаджаў выкананню абавязкаў» дзвюма рукамі. Яшчэ больш заблыталі справу паказанні супрацоўніка крымінальнага вышуку Валянціна Міхневіча, з паказанняў якога вынікала, што Хадыка торгаў за рукаў курткі Алега Суліма таго, калі паводле паказанняў папярэдніх сведкаў знаходзіўся ўжо ў міліцэйскім «варанку».

На здымку: у гэтым «варанку» Ю.Хадыку павезлі ад штаб-кватэры БНФ у невядомым накірунку.

Абвінавачванні растаялі, што пацвярджалі і паказанні сведкаў, якіх запрасіў Юры Хадыка. У заключнай прамове на судзе адвакат Хадыкі Ірына Шабалава падкрэсліла, што ніводнае з абвінавачванняў не даказанае, а значыць, *«складу правапарушэння ў дзеяннях грамадзяніна Хадыкі не было»*. Здзіўленню прысутных не было межаў, калі ў прысудзе прагучала: прызнаць абвінавачванні да Ю.Хадыкі абгрунтаванымі і прысудзіць яму 5 сутак арышту. Цікавы эпізод суда — пры зачытанні прысуду сп.Крывалапаў пераблытаў усё, што магчыма: даты нараджэння яко падсуднага, так і сведкаў, іхнія прозвішчы і г.д.

Каментуючы рашэнне суда, Юры Хадыка заявіў: *«Можна толькі паспачуваць маладому суддзі, перад якім у такой простай справе паўстала такое складанае пытанне. Са свайго боку абвінавачванні не прызнаю, але лічу за гонар у чарговы раз пасядзець за кратамі лукашэнкаўскай турмы»*.

Жонка прафесара Валянціна Зімніцкая паведаміла журналістам, што сп.Хадыка *дастаўлены* для адбывання пакарання ў спецразмеркавальнік на вул.Акрэсціна і ў знак пратэсту распачаў там галадоўку. Акрамя таго жонка Хадыкі збіраецца абскардзіць рашэнне суда Савецкага раёна на той падставе, што в.а.суддзі не меў права выносіць прысуд, а справа слухалася з парушэннм заканадаўства. Але, як вядома, скардзіцца на савецкі суд бессэнсоўна, бо здаўна вядома, што савецкі суд — самы справядлівы суд у свеце.

Ю.К.

ДЗЕНЬ КАНСТЫТУЦЫІ

Магілёў
Свята моладзі

У шэсці, прысвечаным Дню Канстытуцыі, удзельнічала каля 1.500 чалавек. Магілёўскі гарвыканкам не даў афіцыйнага дазволу на маніфестацыю. Напярэдадні міліцыя затрымала 23-гадовага інжынера Андрэя Ільяшэнку і 17-гадовага навучэнца вучылішча культуры Дзяніса Новікава, якія расклейвалі ўлёткі з заклікам прыйсці на акцыю. Міліцыя абвінавачыла хлопцаў у тым, што яны нібыта кідаліся на выпадковых прахожых, нецэнзурна лаяліся і сваімі ўлёткамі пагражалі грамадскай бяспецы. А.Ільяшэнка быў пакараны суддзёй Ленінскага райсуда Магілёва Маймусавым трыма суткамі арышту, а Д.Новікава чакае разгляд у адміністрацыйнай камісіі.

У арганізацыі шэсця ўпершыню брала ўдзел магілёўскае згуртаванне моладзі «Патрыёты Бацькаўшчыны. Рух у Еўропу». Увогуле сярод удзельнікаў пераважала моладзь. Калона прайшла па цэнтральных вуліцах горада, шэсце закончылася мітынгам.

Сымон ГЛАЗШТЭЙН

Гомель
За сцяг – у суд

Мітынг, прысвечаны Дню Канстытуцыі, пачаўся з рэпрэсіяў супраць удзельнікаў. Група міліцыянтаў пад кіраўніцтвам маёра Некрашэвіча затрымала і даставіла ў пастарунак сябра БНФ А.Кочнева. Яго абвінавацілі ў тым, што ён трымаў у руках беларускі нацыянальны сцяг, і загадалі ў панядзелак з'явіцца ў суд Цэнтральнага раёна.

Пасля затрымання Андрэя колькасць бел-чырвона-белых сцягоў у руках мітынгоўшчыкаў толькі павялічылася. На мітынгу, які вёў старшыня Гомельскай рады БНФ Уладзімір Старчанка, была прынятая рэзалюцыя з патрабаваннем аднавіць дзеянне Канстытуцыі 1994 г., спыніць рэпрэсіі супраць удзельнікаў нацыянальна-вызвольнага руху.

Узброеныя відэа- і фотатэхнікай супрацоўнікі гомельскай міліцыі ды КДБ, якія складалі ці не дзесятую частку ўдзельнікаў мітынгу, маўкліва падтрымалі рэзалюцыю.

Уладзімір ВАЛЕЎСКІ

Віцебск
Незвычайнае шэсце

Ад стадыёна «Дынама» да плошчы Свабоды прайшла, так бы мовіць, урачыстая калона з аднаго чалавека. Паэт і выдавец незалежнай газеты «Лад» Юрась Карпаў трымаў у руках кнігу Канстытуцыі 1994 г., а на грудзях — плакат: *«Прэзідэнцкая канстытуцыя незаконная»*.

Тым часам, на плошчы Свабоды рэдактар віцебскай газеты «Выбар» Барыс Хамайда, старшыня рады БНФ «Выбар» Уладзімір Плешчанка ды яшчэ двое мітынгоўцаў трымалі бел-чырвона-белы сцяг і плакаты з выявай укрыжаванай Канстытуцыі 1994 г. Свабода сходаў на плошчы Свабоды трывала роўна 9 хвілін. У 12 гадзін маніфестанты выйшлі на пляц, у 12:04 пад'ехалі міліцэйскія машыны, а ў 12:09 тут заставаліся толькі рэпарцёры ды некалькі спачувальных.

На волю мітынгоўцы выйшлі праз тры гадзіны. Акрамя «выбараўцаў», ніводная палітычная арганізацыя Віцебска Дзень Канстытуцыі не святкавала.

Леанід СІМАНАЎ

Гродна
Шчаслівы бацька выйшаў на пікет

У розных частках горада адбылося 9 пікетаў, арганізаваных мясцовай філіяй БНФ. Удзельнікі трымалі бел-чырвона-белыя сцягі з крыжам пасярэдзіне і плакаты *«Наш дом — Беларусь»*. Пікетчыкі таксама збіралі грошы на дапамогу настаўнікам і рабочым Расіі, якія па паўгода не атрымліваюць зарплаты і галадаюць.

Пікетаванне працягвалася тры гадзіны, і толькі ў адным выпадку адбыўся інцыдэнт. Прахожы, які крычаў, што ён расіянін, сарваў і знішчыў плакат з надпісам «Наш дом — Беларусь». Праваахоўнікі забрала міліцыя.

У аднаго пікетчыка перад самай акцыяй нарадзіўся сын, таму ўвесь пікет, у якім было каля 20 чалавек, быў у асабліва святочным настроі.

С.А.

СКАНДАЛ

Мяжа на замку

У нядзелю, 16 сакавіка, у аэрапорце Мінск-2 беларускія ўлады адмовілі выканаўчаму дырэктару Беларускага фонда Сораса Пітэру Берну ва ўездзе ў нашую краіну. Учора, праз суткі, Пітэр Берн быў вымушаны вылецець у Франкфурт-на-Майне.

Грамадзянін ЗША Пітэр Берн вяртаўся ў Мінск з чарговай камандзіроўкі разам са старшынёй Назіральнага савета БФС Сяргеем Лешуновым. Як толькі Пітэр Берн выйшаў з самалёта, яго спынілі двое ў цывільным, а невядомы аператар пачаў відэаздымкі. У вестыбюлі да Пітэра Берна звярнуўся пагранічнік на англійскай мове. С.Лешуновў пагранічнікі і людзі ў цывільным, якіх аказалася даволі шмат, адмовіліся даць тлумачэнні. Пазней начальнік пагранатрада падпалкоўнік Луцкевіч патлумачыў, што рашэнне аб адмове Пітэру Берну ва ўездзе прынята «кампетэнтнымі органамі» на падставе закона «Аб прававым палажэнні замежных грамадзян і асоб без грамадзянства ў РБ». Падпалкоўнік Луцкевіч адмовіўся паведаміць, якімі кампетэнтнымі органамі прынята рашэнне.

Выканаўчы дырэктар БФС Пітэр Берн на працягу сутак знаходзіўся ў поўнай ізаляцыі. Як было вядома на момант здачы нумара ў друк, да яго не прапусцілі ні супрацоўнікаў фонду, ні прадстаўнікоў пасольства ЗША. Амерыканскаму віцэ-консулу было дазволена праз пасрэднікаў у цывільным перадаць сок і шакалад для Пітэра Берна.

Учора на прэс-канферэнцыі ў Беларускім фондзе Сораса была зроблена спецыяльная заява. У ёй адзначаецца, што дзеянні беларускіх уладаў неабгрунтавана дыскрэдытуюць выканаўчага дырэктара БФС Пітэра Берна і вядуць да дэстабілізацыі работы БФС па аказанню гуманітарнай дапамогі. У 1996 годзе гэтая дапамога Беларусі склала 5,7 млн. долараў. У фондзе лічаць, што ўлады не мелі ніякіх законных падставаў адмовіць Пітэру Берну ва ўездзе ў Беларусь.

Алесь ДАШЧЫНСКІ

Тры гадзіны ў пастарунку

Альгерд НЕВЯРОЎСКІ

Знаходзіцца ў цэнтры Мінска падчас правядзення мірных акцый апазіцыі становіцца справай усё больш небяспечнай. У гэты час паўнаўладным гаспадаром ў горадзе становіцца ваяўнічы хам у форме, які без асаблівых далікатнасцяў можа арыштаваць любога чалавека. У мінулую пятніцу я пераканаўся ў гэтым на ўласным вопыце.

У гэты дзень маладзёжная фракцыя БНФ ладзіла ў сталіцы шэсце пад назваю «Беларусь у Еўропу-2», плануючы абысці амбасады 9-ці краінаў, каб уручыць сваю петыцыю. Атрымаўшы рэдакцыйнае заданне зрабіць рэпартаж з маніфестацыі, я выехаў на плошчу Свабоды — месца збору удзельнікаў акцыі. 16:40. Дваццаць хвілін да пачатку дэманстрацыі. На плошчу сцягнута каля 3 тысяч міліцыянтаў. Яны перакрываюць станцыю метро Няміга. У гэты час на плошчы знаходзілася не больш двух дзесяткаў удзельнікаў акцыі. Сустракаю знаёмых — адваката Арсенія Скаруліся і яго брата (таксама адваката). Стаім, размаўляем. Побач, узад–уперад, снуюдаць міліцэйскія нарады.

Падыходзіць маёр, пытаецца ці *«понимаем мы по-русски»* і загадвае нам пакінуць плошчу. Прад'яўляю сваё рэдакцыйнае пасведчанне і пачынаю тлумачыць маёру, што я выконваю тут свае службовыя абавязкі. Побач з намі спынілася міліцэйская спецмашына, і маёр, выхапіўшы з маіх рук пасведчанне, загадвае сяржантам: *«всех троих в машину!»* Нас запіхнулі ў «варанок» і павезлі ў пастарунак па вул.Інтэрнацыянальнай (побач з кінатэатрам «Перамога»). У аддзяленні ўжо знаходзіцца каля 20 затрыманых, а міліцыя прывозіць усё новыя партыі арыштантаў. Спрабую высветліць у дзяжурнага маёра і ў лейтэнантаў, на якой падставе яны ўтрымліваюць журналіста. У адказ смех і жарты. Міліцыянты хуценька пішуць па адным узоры рапарты на ўсіх затрыманых і едуць за новымі ахвярамі.

Нас заганяюць у «красный уголок», дзе сядзяць ужо 15 чалавек, і некалькі міліцыянтаў пачынаюць запісваць нашыя дадзеныя. 26-гадовага рабочага Алеся Сабаленку затрымалі на плошчы Свабоды за паўгадзіны да пачатку акцыі. Алеся Беленькага, Сяргея Канцавога і Віктара Старухіна схапілі на выхадзе са станцыі метро Няміга. Непаўналетніх Сяргея Апокіна, Цвірко, Немагая і Сераду ўзялі на плошчы. Здараненных амонаўцы прывялі акрываўленага хлопца гадоў 16-ці, ткнулі носам у сцяну і, брудна мацюкаючыся, пачалі абшукваць. Па тварах міліцыянтаў можна было зразумець, што здзекі над хлопцам прыносяць ім нейкую садысцкую асалоду.

Так праходзяць 2 гадзіны знявалення. У 18:45 мяне і адвакатаў Скаруліса вязуць на вул. Арлоўскую ў будынак Цэнтральнага РАУС. Заводзяць у вялікі пакой, дзе за кратамі сядзяць чалавек 40 затрыманых. Тут сустракаю калегу з радыё «Свабода» Алеся Хмяльніцкага — яго схапілі на плошчы і пры затрыманні разбілі дыктафон. Сядзяць вядомы літаратар-перакладчык, член Хельсінкскага камітэта 61-гадовы Васіль Сёмуха. Сядзяць непаўналетнія (якіх, дарэчы, пратрымалі 7 гадзін, хаця за многімі ў райаддзел прыехалі бацькі).

Групай міліцыянтаў, што складалі на затрыманых пратаколы, кіраваў вядомы сваім удзелам у арыштах мірных дэманстрантаў маёр Свістун. Пытаюся ў яго, на якой падставе яны трымаюць двух журналістаў. Маёр робіць здзіўлены твар — хто журналісты? Мы з Алесем паказваем свае пасведчанні. У 19:55 нас вядуць у кабінет намесніка начальніка РАУС маёра Яўгена Полудня, які прыносіць нам прабачэнні і аб'яўляе, што мы свабодныя. Спрабую высветліць прозвішчы міліцыянтаў, якія незаконна мяне затрымалі, але маёр сарамліва апускае вочы і пачынае тлумачыць, што гэта былі супрацоўнікі не іх райаддзела і абяцае абавязкова з імі разабрацца, але прозвішчы не называе. Услед за намі выпусцілі таксама Васіля Сёмуху. Усіх астатніх трымалі да позняй ночы ў райаддзеле, а потым адвезлі ў спецпрыёмнік па вул.Акрэсціна, 36. У камерах іх трымалі два выхадныя дні, а ў панядзелак пачалі даставіць у суды.

Пра вынікі судовых працэсаў мы паведамім у заўтрашнім нумары.

ОФИЦИАЛЬНО

Заявление Государственного департамента США о нарушениях свободы слова и собраний в Беларуси

В Соединенных Штатах сохраняется серьезная озабоченность нарушениями прав человека в Беларуси, в особенности имевшими место на протяжении последних недель. Мы призываем правительство Беларуси проявить сдержанность по отношению к манифестациям в ознаменование Дня Конституции и соблюдать положения тех международных соглашений в области прав человека, к которым Беларусь присоединилась.

5 марта белорусское руководство издало декрет, жестко ограничивающий свободу слова и собраний и предусматривающий суровые наказания за его нарушения. Штаб-квартиры ряда партий подверглись обыску полицией. Мирные акции протеста, состоявшиеся в Минске в начале недели, завершились арестами и задержаниями. Некоторых людей отслеживали и хватали задолго после акции и вдалеке от места ее проведения. В числе других по-прежнему удерживается глава Белорусского народного фронта Юрий Ходыко, который, насколько нам известно, обвиняется в «неподчинении полиции».

США недавно пересмотрели свои отношения с Беларусью. Была избрана политика «избирательных контактов», отражающая те ограниченные возможности для отношений, которые проистекают из нарушений в Беларуси прав человека и непроведения политических и экономических реформ. Как мы уже отмечали, наши отношения с Беларусью будут определяться в первую очередь ее дальнейшими действиями.

Руководство Беларуси заявляет о своем терпимом отношении к инакомыслию — самое время продемонстрировать справедливость таких утверждений.

Вашингтон, 14 марта 1996 г.

© PDF: Kamunikat.org 2010
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Вячеслав ОРГИШ, доктор философских наук

Быть гражданином

О мере гражданской ответственности и безответственности интеллигенции

СВАБОДА напечатала недавно (21 февраля) интересную статью под названием «Не навреди!» Ее автор — кинематографист Олег Павлов справедливо напоминает о том, что ряд деятелей белорусской демократической политсцены ответственны перед историей и народом за плачевные результаты своей деятельности. Необдуманные, поспешные, продиктованные личными амбициями поступки той или иной политической фигуры способны нанести ощутимый вред политическому процессу, свести на нет усилия демократической оппозиции.

Но тут же не менее закономерно возникает вопрос: а какова вина тех, кто уклоняется от участия в политической борьбе? Какой ущерб политическому процессу наносят отсиживающиеся, отмалчивающиеся — прежде всего из числа национальной интеллигенции?

Голоса в курилке

Когда места в рядах демократической оппозиции занимают лица, сотрудничавшие с антинациональными силами, деловито и с огоньком помогавшие взойти на вершину власти тому, кто сегодня методично, шаг за шагом ликвидирует ростки демократии в стране, — здесь все очевидно. Но какова мера ответственности за происходящее (и то, что еще произойдет) тех, кому наблюдать за драчкой со стороны кажется безопаснее, а главное — беспроигрышнее? Тех, кто спрятался под одеяло, кто умудряется жить не по лжи, но и не по правде, кто взял за правило гражданского поведения убогую пословицу: «Я ничего не знаю — моя хата с краю»?

Загляните в курилку, а если нет курилки — в туалет любого КБ, НИИ Академии наук, ВУЗа, где собираются наши интеллигенты перекурить и поотковенничать, блеснуть глубокомыслием на злобу дня. Какие образцы красноречия вам там продемонстрируют, с какими матерными интеллектуалами от политологии, социологии, экономики и прочих наук вам доведется познакомиться! Какие обличительные речи в адрес власть предержащих вы услышите! А сколько крутых эпитетов достанется «самому главному»!

Но вот догорели сигареты, вылетел пар возмущения и разбредаются недавние цицероны и демосфены, лихие обличители режима по своим каморкам. И как сквозь землю проваливаются.

Что-то не видно их на митингах, что-то не слышно их речей принародно, что-то не скрипят их бойкие перья на газетных страницах. Появится в небе один-другой птах, почирикает, почирикает — и снова тишина. Так какова же мера ответственности за будущее, за судьбу демократии в стране тех, кто забился в нору, кто экономит себя, свой ум, предоставляя «делать демократию» тем людям, кого они называют политическими перевертышами?!

Когда думаешь о сбежавшей во внутреннюю эмиграцию части нашей национальной интеллигенции, невольно вспоминаешь грубое ленинское определение. Очень грубое. «Интеллигенция — это не мозг нации, а г...» Отставной классик явно пересолил. Но в чем-то или, по крайней мере, по отношению к кому-то он все же прав.

Пока сопротивление антидемократическому режиму со стороны большей части интеллигенции, национальной элиты будет ограничиваться демонстрацией кукиша в кармане, власть может спать спокойно. Но моральная ответственность за упущенные Беларусью исторические шансы, за бездарно потраченное время ляжет не только на тех, кто метался и совершал ошибки, но и на тех, кто так ни разу и не вытащил фигу из кармана. Быть может, на последних она ляжет основным грузом.

Не навреди гражданским неучастием! Об этом должен помнить каждый, ибо сегодня, как никогда, важно быть гражданином, а не сторонним наблюдателем.

Чем слово наше отзовется?

Независимая печать Беларуси довольно много и напряженно пишет о ситуации в стране. Но есть одно настроение, проступающее в ряде публикаций, разделять которое не хочется. Хотя бы потому, что оно не продуктивно, способно ослабить гражданскую волю, деморализовать силы сопротивления авторитаризму. Имя этому настроению — катастрофизм, безысходность.

Всем пишущим о Беларуси, ее судьбах, перспективах исторического развития не лишне помнить, что не только материальные факторы образуют мир вокруг нас. Мы сами творим его образ — своей волей, мысленным моделированием подталкиваем к тому или иному порядку становления.

Евангельская формула: «Вначале было Слово...» есть напоминание человеку о том, что слово, словесный (мысленный) акт — это активнейшая форма бытия. Своим словом человек не только именует вещи и события, но прочерчивает вектор их возможного развития. Вот почему публицист, публичный политик не имеют права забывать о так называемом «эффекте Эдипа»: известное событие свершается потому, что оно предсказывается.

Мысль изреченная есть больше чем мысль. Восприятие, настроение отдельного человека — только субъективный фокус, отдельная точка зрения, но далеко не истина. Однако, будучи озвученным в слове, это настроение передается другим, становится для них руководством к действию или, наоборот, оправданием бездействия, пессимизма и уныния.

ЛІСТЫ Ў РЭДАКЦЫЮ

Винить вам придется только себя

Так больно иногда смотреть на то полнейшее безразличие, которое сейчас охватило большинство людей. Вам постоянно плюют в лицо, а вы утираетесь и делаете вид, что ничего не заметили. Правда, потом, на кухне вы выскажете своим родственникам все, что вы думаете о Лукашенко и иже с ним. Но, я надеюсь, вы все понимаете, что рано или поздно вам станет нечего кушать. И тогда винить вам придется только себя, а не власть. Ведь всё, что сейчас происходит — происходит с вашего молчаливого согласия. И дети ваши будут обвинять в первую очередь вас, а не поклонников Лукашенко. Ведь те, кто поддерживает Лукашенко, по сути, ни в чем не виноваты. Они — всего лишь жертвы воспитания, необразованности и пропаганды. Но вы-то всё понимаете! И все равно не пытаетесь что-то изменить.

Хочется выразить огромную признательность тем нескольким тысячам минчан, которые мерзнут на митингах и в пикетах, разносят листовки и т.д. Мне часто приходится слышать фразы вроде: «Конечно, митинговать легче, чем работать...» Видимо, того, кто так говорит, ни разу не били резиновой дубинкой, не травили газом. Я сам был свидетелем, как после митинга (разрешенного!), когда люди уже расходились, восемь-десять милиционеров с дубинками набросились на небольшую группу людей и начали их избивать. Просто так, понимаете?!!! Даже если вам на это наплевать, поймите: завтра какой-нибудь омоновец выбьет вам зубы только за то, что вы ему не понравились!

Сергей ЖУР, *г.Минск*

Вся беда – в «недооппозиции»

Уважаемая редакция! Хочу высказать несколько замечаний по поводу статьи г-на Казначеева «Недодиктатура».

Автор убедительно показывает невысокий стандарт, по которому скроен действующий политический режим. Но возникает вопрос: что, это только вчера стало заметно? Всю описательную часть можно и нужно было подавать год назад. Интересно описан и переворот ноября 1996 года, но где же оценки деятельности оппозиции, а еще точнее, оппозиций — «парламентской» (Шарецкий, Гончар, Новиков, Карпенко и т.д.) и «внепарламентской» (БНФ и др.)? А эти оценки многое бы объяснили, особенно в смысле перспектив. Потому что если говорить о «парламентской» оппозиции, то это недооппозиция, иначе она уже была бы при власти. Давать ей советы и возлагать на нее надежды может лишь неисправимый оптимист. Куда интереснее и полезнее было бы проанализировать, изучить эту «оппозицию» — например то, как она использовала (и опошлила) само это слово. Да и история взаимоотношений «недооппозиции» и БНФ имеет в себе немало поучительного.

Тогда, возможно, и советы В.Казначеева стали бы конкретнее. Ведь «оппозиции» нужны не столько имиджмейкеры, сколько воля и решительность, а этих качеств в свободной продаже нет. Если реализовывать «программу Казначеева» для ВС, то вышеупомянутые политики и их соратники могут дружно сесть в тюрьму. Конечно, велика вероятность, что они выйдут оттуда — и выйдут героями, но что-то их туда не тянет, а команда Аголец–Бажелко в роли имиджмейкеров их не устраивает.

Вся беда наша в том, что мы все пытаемся «недооппозицию» выдать за оппозицию. Была бы это оппозиция — не было бы «недодиктатуры».

Д.ЖУКОВСКИЙ, *инженер, г.Гродно*

Ему – некогда...

Прочитал я в газете СВАБОДА статью Вадима Казначеева «Недодиктатура». Первое впечатление: автор буквально брызжет злобой, что ничего не получилось у так называемой «оппозиции» с профессорскими званиями — от Шушкевича, Карпенко и Шарецкого до Богданкевича и Кравченко.

Лукашенко оказался на несколько голов умнее этих «профессоров». Так ловко отшил он «оппозицию»! Молодец! Теперь «оппозиция» во главе с Шарецким бегает по задворкам Минска, чтобы провести очередное заседание Верховного Совета и с гвалтом носится по европам и америкам.

А почему народ Беларуси должен быть против Лукашенко? Ведь у нас экономическое положение значительно лучше, чем во всех других странах СНГ, включая Россию. Есть какая-то подвижка в экономике. Зарплата, пусть невысокая, пенсии, пусть тоже невысокие, но выплачиваются. Что возмущает Казначеева, так это то, что Лукашенко не принимает к «оппозиции» жестких мер. Вот если бы он поломал их как следует, тогда бы все было отлично, был бы повод на новые провокации. А он этого не делает. Одним словом, «недодиктатор».

Оппозиционные профессора прикрываются своими липовыми диссертациями. Да такие диссертации и звания Лукашенко получил бы запросто — но ему некогда, он работает на народ. И за свои дела он уже заслужил звание народного академика.

БОРИСЕНКО Мирон Данилович, *пенсионер, инвалид ВОВ, г.Чаусы*

ПАСЛЯ АКЦЫІ

Міліцэйская аблога

З вечара 15 сакавіка мінская міліцыя пачала аблогу кватэраў палітыкаў, якія бралі ўдзел у шэсці на Дзень Канстытуцыі.

Да **Генадзя Карпенкі** міліцыя першы раз наведалася ў суботу ў 11 вечара. Па словах суседзяў, міліцыянтам ніхто не адчыніў, аднак яны працягвалі званіць і грукаць у дзверы так, што было чуваць ва ўсім пад'ездзе. Паўторныя візіты былі раніцай у нядзелю, потым апоўдні і вечарам. Урэшце ў дзвярах пакінулі павестку, якой «правапарушальніку Карпенку Г.Д.» загадана з'явіцца ў Фрунзенскі РАУС. Аблога дома, дзе жыве віцэ-спікер ВС, працягвалася і ў панядзелак, прычым міліцыянтам прывезлі службовых сабак. У Г.Карпенкі павысіўся ціск, ён быў вымушаны выклікаць «хуткую дапамогу».

Да **Сямёна Шарэцкага** прыйшлі ў нядзелю. Шарэцкі адмовіўся падпісваць якія-небудзь паперы, бо не лічыць удзел у святочным шэсці парушэннем. *«Па праспекце нас вёў палкоўнік міліцыі, усе прэтэнзіі да яго»*, — заявіў спікер ВС і папрасіў наведвальнікаў пакінуць кватэру.

Георгій Таразевіч, параіўшыся з сям'ёй, пусціў у хату трох міліцыянтаў, якія паззванілі ў дзверы а 10-й гадзіне вечара ў суботу. Ён старанна запісаў прозвішчы і пасады сваіх наведвальнікаў з Партызанскага РАУС Мінска. Асабліва здзівіла Таразевіча, што адзін з трох, Аляксей Лаўкачоў, працуе старшым оперупаўнаважаным па барацьбе з эканамічнай злачыннасцю. Госці прад'явілі дакумент, што Г.Таразевіч абвінавачваецца «ў арганізацыі мітынгу і шэсця». Абураны гаспадар пастаравіў на паперы рэзалюцыю: *«Усё напісанае не адпавядае сапраўднасці»*, — і папрасіў міліцыянтаў з кватэры.

Тры спікеры парламента — Станіслаў Шушкевіч, Мечыслаў Грыб і Сямён Шарэцкі 15 сакавіка мірна крочылі ў галаве калоны.

Трое міліцыянтаў правялі нядзелю і нават ноч на панядзелак побач з кватэрай **Мечыслава Грыба**. Цяпер калідор, дзе начавалі міліцыянты, увесь запляваны семкамі. Раніцай у панядзелак Мечыслаў Іванавіч зжаліўся над былымі калегамі і пусціў іх у кватэру. Азнаёміўшыся з пратаколам, Грыб напісаў на ім свой адмоўны каментар.

А вось ля кватэры былога міністра абароны **Паўла Казлоўскага** дзяжурылі, па падліках ягонай жонкі, восем міліцыянтаў і некалькі чалавек у цывільным. У нядзелю Наталля Рыгораўна Казлоўская спраўляла сваё пяцідзесяцігоддзе. Будучы ў добрым настроі, гаспадыня запрасіла да стала і міліцыянтаў, але тыя адмовіліся. Раніцай у панядзелак жонка былога міністра абароны перайшла да больш «хітрых» метадаў: яна выклікала па тэлефоне журналістаў з расійскага тэлебачання, якія сваім з'яўленнем так напужалі міліцыянтаў, што тыя літаральна збеглі.

Спрабавалі міліцыянты сустрэцца і з **Станіславам Багданкевічам**. Па ягоных словах, госці ў форме прыходзілі таксама на кватэру ягонага старэйшага сына, у якога цікавіліся, ці маe былы галоўны банкір краіны паляўнічую стрэльбу. *«Няўжо яны думаюць, што я збіраюся адстрэльвацца?»* — сказаў СВАБОДЗЕ Станіслаў Багданкевіч. — *Дарэмна. Калі трэба будзе, я гатовы адсядзець за свае погляды ў турме»*.

Анатоль Лябедзька, чыя кватэра таксама была ў аблозе, так патлумачыў сваё нежаданне сустрэцца з міліцыяй: *«Я не прызнаю прэзідэнцкі дэкрэт № 5 і таму не збіраюся нават знаёміцца з дакументамі, складзенымі на падставе гэтага дэкрэта. Ён для мяне ўсё роўна як указ, выдадзены правадыром афрыканскага племені»*.

Па звестках рэдакцыі, міліцыянты спрабавалі знайсці таксама **Юрыя Захаранку** і **Станіслава Шушкевіча**. Каля дома былога міністра ўнутраных спраў несла вахту ўзброеная спецназаўцы ў бронекамізэльках. У панядзелак генерал Ю.Захаранка сам паехаў у Кастрычніцкі райаддзел міліцыі, каб высветліць, што ж ад яго хочуць.

У дзверы кватэры С.Шушкевіча пазванілі ў ноч з суботы на нядзелю, паўтараліся гэтыя візіты праз кожныя тры гадзіны. Між тым яшчэ падчас шэсця С.Шушкевіч развітаўся з калегамі і паехаў у аэрапорт, бо спяшаўся на навуковую канферэнцыю ў Германію. Натуральна, органам пра гэта было вядома, але да простых міліцыянтаў, якім загадана «знайсці Шушкевіча», гэтую інфармацыю давесці, відаць, не паклапаціліся.

Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ

ФОНАРЬ АККУМУЛЯТОРНЫЙ ИНДИВИДУАЛЬНОГО ПОЛЬЗОВАНИЯ

- Источники питания – герметичные щелочные аккумуляторы, не требущие доливки электролита
- Встроенное зарядное устройство от сети 220 В
- Номинальное напряжение – 3,6 В
- Освещенность – 120 лк
- Продолжительность непрерывного горения – 14 часов
- Габаритные размеры: 240 х 74 х 230 мм
- Срок службы – 5 лет

Тел.: (017) 266-13-09

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Гарэў сметнік пад замком

У Дзень Канстытуцыі давялося добра папрацаваць мінскім пажарным, якія апоўдні прыімчалі па сігнале трывогі да дома №5 на вул. Індустрыяльнай.

Гарэў двухпавярховы цагляны хлеўчык, які належаў жыхарам гэтага дома. Каб справіцца з агнём, пажарным давялося ўзламаць з паўтара дзесятка абабітых жалезам дзвярэй: да замкоў у спешцы не знайшлося ключоў.

Якога толькі ламачча, друзу і смецця на давялося выкінуць пажарным, каб затушыць полымя! Гаспадары ператварылі свае нумараваныя катухі ў сапраўдныя сметнікі пад замкамі. А двор каля дома нагадваў сапраўдную памыйку. Я сумняваюся, што нават агонь дапаможа такім гаспадарам навесці парадак там, дзе гуляюць іхнія дзеці і жывуць яны самі.

Васіль СТУЖКА

Дзверы ламалі адбойным малатком, а смецце даводзілася выграбаць рукамі.

У польскай турме павесіўся беларус

33-гадовы беларус Генадзь Л. павесіўся ў турэмнай камеры ў польскім горадзе Вроцлаў.

Пра гэта паведаміў прэс-сакратар ваяводскай пракуратуры Томаш Федык. Магчыма, што над беларусам здзекваўся паляк, што сядзеў з ім у адной камеры. Пракуратура вядзе следства па гэтай справе.

Мёртвага беларуса, які з пятлёй на шыі сядзеў на ўнітазе, знайшоў раніцай у аўторак вартаўнік. Паколькі ў момант, калі беларус сканаў, паляка дапытвалі паліцэйскія, следства выказвае версію, што гэта было самагубства. Генадзь Л. падазраваўся ў злачынствах у адной з заходніх краінаў.

Марцін СМЯЛОЎСКІ

Праз 15 гадоў рванула

Два хлопчыкі ледзь не загінулі ад выбуху патрона, які застаўся ляжаць у зямлі пасля авіякатастрофы

Гэта здарылася ў вёсцы Цырын Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці. Браты Юра і Алег Лук'янчыкавы былі параненыя ў выніку выбуху буйнакалібернага патрона да зенітнай авіягарматы. Гэтую небяспечную «цацку» браты спрабавалі разабраць на часткі — і прагрымеў выбух. Хлопчыкі знайшлі патрон на калгасным полі, куды напачатку 80-х гадоў упалі рэшткі двух самалётаў-знішчальнікаў, якія сутыкнуліся ў небе падчас трэніровачных палётаў. Пра гэту малавядомую трагедыю цяпер нагадвае толькі абеліск, на якім выбітыя прозвішчы чатырох палеглых лётчыкаў.

Алесь КАСТРАВІЦКІ

СПОРТ

Гандбол: беларускія дзяўчаты ў фінале

Жаночая зборная Беларусі, атрымаўшы перамогу над зборнай Азербайджана 30:16 (дома) і 26:23 (у гасцях), стала пераможцай адборачнага турніру на першынство свету і цяпер выступіць ў фінальнай стадыі, якая пройдзе ў лістападзе ў Германіі.

БІЯТЛОН: ПАРАМЫГІНА НАГАДВАЕ ПРА САБЕ

Шведка Магдалена Форсберг і немец Свен Фішэр заваявалі Кубкі свету па выніках сезону. У Форсберг — 319 ачкоў, і яе ледзь не абышла Ушы Дызль з Германіі — 318. На трэцім месцы яшчэ адна германская біятланістка Сімона Грайнэр — 281 ачка. Мінчанка Святлана Парамыгіна ў агульным заліку заняла сёмае месца — 229. Наталля Пермякова — 51-я, Наталля Рыжанкова — 52-я. «Малыя» Кубкі за перамогі на дыстанцыях 15 і 7,5 км дасталіся Дызль.

Парамыгіна вельмі ўдала правяла гонкі заключнага этапу ў Новасібірску: яна перамагла ў першай гонцы і заняла трэцяе месца ў другой.

У мужчын трыо мацнейшых выглядае так: Свен Фішэр – 312 ачкоў, Оле-Эйнар Б'ёрндален (Нарвегія) – 303. Віктар Майгураў (Расія) – 285. Алег Рыжанкоў з Магілёва на сёмай пазіцыі – 233 ачкі, мінчане Вадзім Сашурын – 19-ы, Аляксандр Папоў – 35-ы, Аляксей Айдараў – 37-ы, Пётр Івашка – 60-ы.

«Малы» Кубак свету на дыстанцыі 10 км заваяваў Б'ёрндален, на 20 км — Рыка Грос (Германія).

У камандным заліку нашыя хлопцы на пятым месцы, дзяўчаты — на сёмым.

ЛЫЖЫ: ПЯЦЁРКІ АЛЕНЫ ВЯЛЬБЕ

Расіянка Алена Вяльбе заняла другое месца ў 30-кіламетровай гонцы вольным стылем на Халменколенскіх гульнях — заключным этапе розыгрышу Кубка свету, адстаўшы ад італьянкі Стэфаніі Бельмонда на 1 хвіліну 52,5 секунды. Аднак яна пяршынствавала ў агульным заліку, заваяваўшы ганаровы трафей. У выніку ў Вяльбе — 940 ачкоў. На наступных месцах Бельмонда — 909 і Кацярына Нойманава з Чэхіі — 525.

«Ёсць нешта сімвалічнае ў тым, што ў гэтым годзе я заваявала пяць залатых медалёў на чэмпіянаце свету ў Транхейме. Бо мне ўжо ў пяты раз дастаўся Кубак свету», — сказала ў эксклюзіўным інтэрв'ю карэспандэнту ИТАР-ТАСС Алена Вяльбе. Гэтую прэстыжную ўзнагароду знакамітай спартсменцы пад выбух авацый тысячаў заўзятараў уручыў асабіста кароль Нарвегіі Харальд V.

Вяльбе раней ужо гаварыла, што пасля Алімпіяды ў Нагана збіраецца пакінуць вялікі спорт. *«Гэта ўжо вырашана канчаткова»*.

У мужчын лепшым аказаўся знакаміты нарвежац Б'ёрн Дэлі — 845 ачкоў. За ім ідзе фін Міка Мюлюля — 580 і італьянец Фульвія Вальбуза — 523.

ТЭНІС: ЗВЕРАВА Ў ПАРЫ НЕПАРАЎНАЛЬНАЯ

У Індыян-Ўэлсе (ЗША) у парным разрадзе жаночы турнір выйгралі мінчанка Наталля Зверава і алімпійская чэмпіёнка амерыканка Ліндсэй Дэвенпорт. Іх дуэт у фінале ўзяў верх над Лайзай Рэйманд (ЗША) і Наталі Тозья (Францыя) — 6:3, 6:2. У адзіночным разрадзе перамаглі тая ж Дэвенпорт і яе суайчыннік Майкл Чанг.

ГАРНАЛЫЖНЫ СПОРТ: УПЕРШЫНЮ

У амерыканскім Вэйле (штат Каларада) прайшлі заключныя старты Кубка свету. Галоўныя трафеі ўпершыню ўручаныя французу Люку Альфану і шведцы Перніоле Віберг.

У асобных дысцыплінах лепшымі сталі Рэнатэ Гётчль з Аўстрыі і Альфан (скарастны спуск), Томаш Сікора (Аўстрыя) і Віберг (у слаламе), Хільдэ Герг (Германія) і той самы Альфан (супергігант), Дэбора Кампаньёні (Італія) і Міхаэль фон Груніген (Швейцарыя; слалам-гігант).

ХАКЕЙ: «СОКАЛ» АЛЬБО «ЮНІЁРС»

4 матчы за званне чэмпіёна Усходнееўрапейскай хакейнай лігі паміж кіеўскім «Сокалам» і рыжскім «Юніёрсам» прынеслі раўнавагу — 2:2. Усе вырашыць пяты паядынак. А трэці прыз у навапалацкага «Паліміра», які перамог у серыі гродзенскі «Нёман» — 3:1.

ШАХМАТЫ: 14-ГАДОВЫ ВУНДЭРКІНД

Міжнародны шахматны турнір у французскім Энг'ян-ле-Бэне пачаўся з сенсацыі: 14-гадовы вундэркінд Эцьен Бакро з Францыі абыграў чорнымі фігурамі знакамітага Віктара Карчнога з Швейцарыі, які на 51 год старэйшы і ў якога на 135 пунктаў больш ў сусветным рэйтынг-лісце. На гэтым спаборніцтве Бакро можа, дарэчы, стаць самым юным гросмайстрам ў свеце за ўсю гісторыю шахмат. Для гэтага яму патрэбна ў дзевяці партыях набраць 6 ачкоў і атрымаць трэці гросмайстарскі бал: два першых ён мае за паспяховыя выступленні на Сусветнай алімпіядзе-96 у Ерэване і турніры ў Вэйк-ан-Зээ (Нідэрланды).

ЦЯРПЛІВЫ «ДЫНАМІТ»

Знакаміты расійскі асілак — Уладзімір «Дынаміт» Турчынскі, вядомы тэлегледачам па гульнях гладыятараў, упэўнена трымаў на месцы два японскія кросавыя матацыклы «Хонда», хоць рухавікі раўлі на поўную моц.

На спартыўнай базе ў Крылацкім у Маскве прафесійная ліга сілавых шоў-праграм арганізавала гэты трук для Кнігі рэкордаў Гінэса. Аднак шоў сарвалася, хаця і не па віне Турчынскага. Матацыкл, які ўтрымлівала левая рука волата, увайшоў заднім колам сантыметраў на 20 у зямлю, матор яго заглух. А з «правай» машыны матацыкліст проста зваліўся.

Каб усё ж такі неяк «суцешыць» некалькі соцень заўзятараў, арганізатары відазмянілі трук: адзін канат прывязалі да канструкцый трыбун стадыёна, а другі, прывязаны да матацыкла, ўзяў у руку Турчынскі. Аднак вынік быў той самы: матацыкл заднім колам зарыўся ў зямлю амаль на паўметра, але не прасунуўся ні на сантыметр.

Сямён ПЛОЦ

РЫНОК

Где купить стиральную машину – на «Динамо» или в магазине?

Представитель фирмы *Bosch-Siemens* Драган Иличич, приехавший в Минск, рассчитывает на увеличение объемов продаж в Беларуси. Однако, кроме политической ситуации, у нас этому может помешать и государственная валютная политика.

Свои надежды г-н Иличич связал прежде всего с качественным фирменным сервисом (это в некоторых случаях оказывается для покупателя важнее стоимости техники). Не секрет, что на бытовую технику *Bosch-Siemens* цены весьма высоки, однако объемы продаж через сеть специализированных магазинов заметно увеличились — например, в Минске по итогам января–февраля 1997 года вдвое. Это свидетельствует и о том, что людей, способных платить большие деньги за высокое качество, не стало меньше.

В СНГ самый значительный рынок для *Bosch-Siemens* — Россия. В 1996 году на каждого жителя РФ было продано техники в среднем на 1,2 DM (в Москве — на 8,5 DM). В Беларуси эта цифра составила лишь 0,18 DM.

Несколько отличается и структура потребления бытовой техники в Беларуси. На первом месте во всех странах СНГ по объемам продаж находятся стиральные машины, на втором — холодильники, затем электроплиты, посудомоечные машины и пылесосы. У нас после «стиралок» идут пылесосы, электроплиты и др. Холодильники занимают одно из последних мест, и это явно свидетельствует, что минский «Атлант» производит действительно хорошие холодильные агрегаты.

Есть у *Bosch-Siemens* (впрочем, как и у всех иностранных производителей) ценовая проблема. Дело в том, что какими бы минимальными ни были «накрутки» и до какой бы величины ни доходили бы различные скидки, в фирменных магазинах цены все-таки высоки. На местных вещевых рынках типа минского «Динамо» или у частных торговцев, дающих объявления, бытовая техника этих же фирм примерно в 1,5 раза дешевле. Связано это прежде всего с различием курса наличного и безналичного доллара в Беларуси, что делает официальную продажу менее выгодной.

Конечно, гарантийное и сервисное обслуживание, которое могут предоставить официальные дилеры фирм-производителей, едва ли можно получить еще где-то (хоть продавцы техники на рынках и стараются это сделать). Поэтому покупатель стоит перед выбором: переплатить 300–400 долларов, к примеру, за хорошую электроплиту или стиральную машину в фирменном магазине (просто потому, что в стране проблемы с валютой), но взамен получить возможность приличного сервиса, или же купить технику на рынке — на свой страх и риск.

Вероника СТРОЕВА

Конфликт в Ждановичах: прокуратура предупредила администрацию

В конце февраля предприниматели рынка в Ждановичах провели два митинга, протестуя против двухкратного повышения стоимости аренды торговых мест. Администрация рынка все-таки повысила арендную плату, и к тому же применила явно репрессивные меры к одной из организаторов «беспорядков» на рынке: сперва ее лишили торгового места, а затем и вовсе выдворили с рынка с помощью службы безопасности ТД «Ждановичи».

Предприниматель обратилась в прокуратуру, и дело обернулось совершенно неожиданно для руководства ТД. Во-первых, в адрес администрации пришло предупреждение прокуратуры о *«недопущении применения насилия как со стороны руководства рынка, так и его службы безопасности»*. Директор рынка А.Ралько был предупрежден об уголовной ответственности в случае воспрепятствования законной деятельности профсоюзной организации на рынке. Прокуратура также предложила восстановить нарушенное право предпринимателя на осуществление торговли на територии Торгового дома.

Теперь администрации рынка в Ждановичах придется вести себя скромнее. Предпринимателей же этот случай, видимо, воодушевит на дальнейшую борьбу за свои права.

Вероника СТРОЕВА

КОШТЫ РЭКЛАМНАЙ ПЛОШЧЫ ў газеце СВАБОДА:
у рэкламным блоку — 33000 руб./см²
на асобнай паласе — 40000 руб./см²
у тэлевізійнай праграме — 44000 руб./см²
на першай паласе — 110000 руб./см²
Даведкі па тэл. 236-24-41

САМАЯ ДЕШЕВАЯ ОФСЕТНАЯ БУМАГА
в пачках по 500 листов (2,5 кг)
Формат А4, плотность 80, белизна 82%
Цена 75 000 за пачку
Тел.: 8-0172-100-253

Стэлажы і стойкі

Выпрабляем стэлажы для складскіх памяшканняў для любых відаў прадукцыі.
Тэл. (017) 236-24-41

© СВАБОДА Падпісны індэкс 63887 E-mail: edit@svaboda.minsk.by СВАБОДА ў Internet: http:\\www.gis.minsk.by Спасылка на газету СВАБОДА абавязковая Наклад 41.480
Нумар падпісаны ў друк 17.03.97 (15:00) Надрукавана на паліграфічнай фабрыцы «Чырвоная зорка» (г.Мінск, 1-шы Загарадны завулак, 3) ЛВ № 215 Заказ 281

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010